# ФАРМІРАВАННЕ МАЎЛЕНЧЫХ УМЕННЯЎ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ДЗЕЯСЛОВА

***Лахвіч І.В.****(УА МДПУ імя І.П. Шамякіна, г. Мазыр)*
***Навуковы кіраўнік –*** *Н.А. Барысенка, канд. філал. навук, дацэнт*

Развіццё мовы і маўлення адна з найважнейшых задач навучання беларускай мове ў пачатковых класах. Яна ажыццяўляецца ў працэсе ўсёй вучэбна-выхаваўчай работы на ўроках і ў пазакласны час. Атрымліваючы веды з любой галіны навукі, вучні знаёмяцца з новымі словамі, тэрмінамі. Гэтыя веды ўзбагачаюць іх мысленне, удасканальваюць мову.

На практыцы важна не толькі навучыць школьнікаў выражаць свае думкі ў вусных і пісьмовых выказваннях, а развіваць якаснае маўленне дзяцей – змястоўнае, лагічнае, чыстае, дакладнае, дарэчнае, правільнае, выразнае, вобразнае і багатае.

Вывучэнне марфалогіі ў школе, у прыватнасці дзеяслова, заключае ў сабе шырокія магчымасці для работы па развіцці якаснага маўлення вучняў. Для гэтага перш за ўсё неабходна разуменне лексічных і граматычных значэнняў, што ў сваю чаргу прадугледжвае развіццё ў школьнікаў лексічных і граматычных навыкаў.

Аднак вывучэнне дзеяслова ў пачатковых класах выклікае ў вучняў пэўныя цяжкасці, бо гэта складаная і ёмістая часціна мовы, якая разам з тым выконвае значную ролю ў развіцці маўлення школьнікаў. Засваенне граматычных катэгорый і форм дзеяслова павінна весціся ў функцыянальным аспекце, што прадугледжвае знаёмства з асаблівасцямі іх выкарыстання ў маўленні, магчымасцямі ў передачы разнастайных сэнсавых і стылістычных адценняў, а таксама ўзбраенне вучняў уменнем карыстацца формамі і канструкцыямі розных тыпаў.

Формы работы па развіцці мовы і маўлення пры вывучэнні дзеяслова вельмі разнастайныя. Яны могуць і павінны выкарыстоўвацца як пры выкананні практыкаванняў падручніка, так і пры працы з заданнямі і тэкстамі, падрыхтаванымі настаўнікам папярэдне на картках, у электронным варыянце, пры вывучэнні любой тэмы па дзеяслове. Значную ролю для развіцця мовы, маўлення і мыслення адыгрывае праца са звязным тэкстам. Такі від працы паказвае малодшым школьнікам, як рэалізуюцца ў тэксце моўныя з’явы, граматычныя формы слова, як будуецца сам звязны тэкст. Таму што далей будзе праводзіцца праца па стварэнні самімі вучнямі звязных тэкстаў. Гэта напісанне сачыненняў, творчых работ (будова сказаў, узнаўленне прапушчаных элементаў сказаў, тэксту), пераказаў і іншыя віды работ.

МГПУ им. И.П.Шамякина